**Пашэвіч, В**. Няма нічога даражэйшага за Радзіму / В. Пашэвіч // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2003. — 15 лют. — С. 2.

**НЯМА НІЧОГА ДАРАЖЭЙШАГА ЗА РАДЗІМУ**



Не ведаю, чаму ў Тумілавічах мясцовае насельніцтва тых мужчын, каму давялося ў свой час выконваць інтэрнацыянальны доўг у Афганістане, сёння называе «душманамі». Не злосна, не насмешліва, а проста, каб вылучыць з іншых. Асабіста мяне страсанула, калі я пачула гэта.

«Душман» – значыць «вораг». Як можна звяртацца такім словам да людзей, якія аддалі пэўны тэрмін маладых гадоў, прычым, не па свайму жаданню і выбару, а па загаду і абавязку, службе ў гарачым Афганістане? Якія ж яны «душманы», калі рызыкавалі ўласнымі жыццямі, калі хавалі загінуўшых сяброў, з якімі разам служылі? Многія з воінаў-інтэрнацыяналістаў маюць баявыя ўзнагароды, нямала сярод іх тых, хто вымушаны пасля службы ў Афгане стаць пастаянным пацыентам бальніц, шпіталяў і спецыялізаваных медыцынскіх цэнтраў, жыць з раненнямі, калецтвамі. І ўсіх, без выключэння, яднае балючая «афганская» памяць.

У 1985 годзе прызвалі ў рады Савецкай Арміі Анатоля Ільіча Парцянку. Да службы вучыўся ў Лужаснянскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Аднойчы, слухаючы расказ хлопца, дэмабілізаванага з Афганістана, у Толі мільганула шалёная думка: «Няўжо і я траплю ў Афган?» Яна стала прароцкай.

– Не шанцавала мне адразу. Прызывалі вясной. І провады адгулялі, і развіталіся. Даехаў да Віцебска, пэўны час там прабыў. Усе хлопцы паехалі па месцах далейшай службы, а мяне вярнулі дадому. Давялося чакаць наступнага, восеньскага прызыву. Вось тады я ўжо стаў салдатам, – расказвае Анатоль Парцянка.

Ён добра памятае, як іх везлі восем сутак з Віцебска, потым верталётамі закінулі на пагранічныя горы. Так пачалася служба ў пагранвайсках у гарах, на чужыне, дзе душманы – не на словах.

– Нас было трое з Докшыцкага раёна: я, Коля Маслоўскі з Порплішча і яшчэ адзін зямляк. Колю два разы кантузіла. Мяне ледзь не накрыла 27 снежня, калі мы трапілі пад камнепад, – успамінае А. І. Парцянка.

Харчаванне было стабільна якасным. Радавала, што тушонкі прывозілі з Беларусі, а

згушчанае малако наогул было глыбоцкім. Здавалася, гэта – як прывітанне з радзімы.

Плячо да пляча служылі ў чужой паўднёвай краіне, ваявалі на чужой вайне беларусы, расіяне, украінцы, узбекі, таджыкі. Па словах Анатоля, жылі адной сям’ёй. Гэтаму вучылі старaслужачыя. 3 тых часоў сяброўства застаецца для Анатоля Парцянкі галоўным чалавечым пачуццем. Як усе былыя воіны-інтэрнацыяналісты, ён застаецца верным моцнаму афганскаму братэрству, калі адзін за ўсіх, а ўсе – за аднаго.

– Служачы на граніцы, мы прыкрывалі самі сябе, мужна выконвалі загад. Памятаю кожнага, з кім давялося служыць разам. Ды і наогул, калі мужчына прайшоў Афганістан, няхай у іншы час, у іншым месцы, мы ўсё роўна адзін аднаго лічым сапраўднымі таварышамі. Нас аб’ядноўвае Афган, – заўважыў старшына запасу.

А яшчэ ад гэтага чалавека я пачула, якое прыгожае відовішча адкрываецца вачам, калі глядзіш з вышыні гор уніз, у час цвіцення садоў. Кветкі і водар дурманяць, нясуць асалоду. Ды нават гэтыя пейзажы не пераўзыходзілі сваімі росквітам і пышнасцю сціплых, але звычных родных беларускіх краявідаў.

– Сапраўды, нічога няма даражэйшага за Радзіму, – упэўнены Анатоль Ільіч Парцянка.

**В. Пашэвіч**